# Адкрываючы беларускую гісторыю разам з Караткевічам

ПАЎЛА БАРОЎСКА*

**Karatkevich, Uladzimir.**
*King Stakh's Wild Hunt:* Glagoslav Publications
(на ангельскай мове): London, 2012. – 291 p.
£18,80 (папяровая вокладка)
ISBN: 9781909156104.

"Дзікае паляванне караля Стаха" Ўладзіміра Караткевіча выйшла ў свет у выданні "Глагослаў Паблікэйшнз" пры канцы 2012 года. Гэтая кніга дазваляе бліжэй пазнаёміцца з беларускай гісторыяй. Расказаная ў ёй гісторыя была экранізаваная.

Уладзімір Караткевіч (1930–1984) – выбітны і ўплывовы беларускі аўтар, адзін з галоўных натхняльнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння. Ён пісаў прозу, паэзію, драмы і кінасцэнары, але застаўся найбольш вядомы як стваральнік гістарычных раманаў, прысвечаных падзеям беларускай гісторыі.

Уладзімір Караткевіч атрымаў шэраг нацыянальных літаратурных узнагарод, у тым ліку дзяржаўную прэмію БССР імя Якуба Коласа. Яго літаратурны плён стаў росчынам для гістарычнага рамана як жанру ў Беларусі.

"Дзікае паляванне" ўпершыню выйшла ў 1964 годзе, калі сацыялістычная Беларусь была часткай Савецкага Саюза. Цікава, што падзеі рамана разгортваюцца ў канцы XIX стагоддзя на тэрыторыі сучаснай Беларусі. На той час гэтыя землі былі далёкай заходняй правінцыяй Расійскай імперыі, з моцнымі польскімі культурнымі ўплывамі.

Андрэй Беларэцкі, галоўны герой, – даследнік даўніны і цікавіцца народнымі легендамі. Аднак больш за ўсё яму хочацца зразумець гістарычную долю беларусаў. Здаецца, голасам галоўнага героя гаворыць сам Караткевіч. Сама гісторыя становіцца ўсяго толькі нагодай для аўтара зразумець беларусаў.

* Паўла Бароўска – аналітык Цэнтра пераходных даследаванняў у Лондане.

Беларэцкі шчыра занепакоены, калі пытае: “Няўжо такі забіты, няўжо такі мёртвы мой народ?”

Андрэй Беларэцкі – малады этнограф. Згубіўшыся падчас экспедыцыі, ён знаходзіць прытулак у мясцовым палацы ў Балотных Ялінах. Калі ён туды прыязджае, ён не ўяўляе, што гэты прытулак у змрочным палацы радыкальна пераменіць яго жыццё. Дзяўчына па імені Надзея, апошні нашчадак роду Яноўскіх, аказваецца ўладаркай палаца.

Маладая гаспадыня расказвае Беларэцкаму старую сямейную легенду пра паляванне караля Стаха на членаў сям’і. Як апошні жывы спадкаемец Надзея ўпэўненая, што яна мусова мае стаць ахвярай дзікага палявання і такім чынам спыніць праклён. У Надзеі зацікаўленыя прынамсі некалькі мясцовых шляхцічаў. Прыватная варажнеча і сквапнасць штурхаюць іх да ўдзелу ў загадкава спланаванай інтрызе. Андрэй вырашае затрымацца ў Балотных Ялінах і развязаць загадку. Іх знаёмства пакрысе ператвараецца ў сапраўднае сяброўства.

Ад пачатку Андрэй скептычна ставіцца да легенды пра дзікае паляванне. З часам ён сустракае шмат сяброў сярод мясцовых сялянаў, гатовых дапамагчы яму разблытаць таямніцу дзіўных здарэнняў. Адным з яго новых прыяцеляў становіцца малады навуковец Андрэй Свеціловіч, які не згодны з грамадскай несправядлівасцю, што пануе навокал.

Караткевіч запрашае чытача ў свет загадкавага і захапляльнага сюжэта. Аўтар апісвае кожную дробную дэталь краявідаў, дзякуючы чаму гісторыя становіцца надзвычай маляўнічай і праўдападобнай. Народная легенда пра дзікае паляванне, з некаторымі рэгіянальнымі адхіленнямі, была шырока вядомая ва ўсёй Еўропе.

З такога апісання вытыркаецца свет глыбокай сацыяльнай несправядлівасці. У той час як сяляне нясуць асноўны цяжар непасільнай працы на маёнтках гаспадароў, распешчаныя мясцовыя шляхцічы цікавяцца толькі пашырэннем сваёй уласнасці і ўплываў. Хоць гісторыя “Дзікага палявання Караля Стаха” разгортваецца ў канкрэтных гістарычных і рэгіянальных варунках, яна паказвае і больш універсальную рэальнасць пасляфеадальнай Усходняй Еўропы канца XIX стагоддзя.

Акрамя рамантычнага матыву і крымінальнай завязкі, Караткевіч прапануе чытачу гісторыю пра несправядлівыя дачыненні між землеўласнікамі і сялянамі. Канфлікт, паказаны ім у рамане, выглядае сімвалічнай вайной між прывілеяванай мясцовай шляхтай і падпарадкаванымі сялянамі.

Галоўныя героі Караткевіча – яркія асобы. У той жа час, з развіццём падзей у рамане, чытач здагадваецца, што некалькі персанажаў не тыя, кім

яны здаюцца. З часам чытач можа, разам з Андрэем Беларэцкім, пабачыць сапраўдную сутнасць мясцовай шляхты.

Галоўны пратаганіст – прыязная асоба. Ён добра адукаваны, шчыры, высакародны, з моцным маральным стрыжнем. Ён застаецца таксама на баку сваёй нацыі: “Няшчасная Беларусь! Добры, памяркоўны, рамантычны народ у руках такой поскудзі. І пакуль гэты народ будзе дурнем, так будзе заўсёды” (с. 105). Шукаючы разгадку інтрыгі, ён насамрэч шукае згубленую беларускую ідэнтычнасць – культуру і мову, не забываючы і пра сацыяльную несправядлівасць, ад якой пакутуюць сяляне. Можа здацца, што гэта голас самога Караткевіча, які, разам са сваім галоўным пратаганістам, аплаквае долю беларускай нацыі.

Караткевіч/Беларэцкі стварае партрэт сваёй уласнай нацыі, у якой няма ні выразнай ідэнтычнасці, ні павагі да гістарычнай спадчыны ці беларускай мовы, нацыі, якая разрываецца між мацнейшымі польскімі і расійскімі ўплывамі, заўсёды ўсяго толькі памежжа між нацыямі. Ён заўважае: “Хоць сярод дробнай шляхты размаўлялі па-беларуску, шляхта буйнейшая тагачаснага грамадства (…) мовы не ведала (…) усе ж іншыя размаўлялі на дзіўнай сумесі польскіх, расейскіх і беларускіх слоў” (с. 84–85).

“Дзікае паляванне караля Стаха”, безумоўна, варта прачытаць, але ў тых, хто зусім не знаёмы з беларускай гісторыяй і яе культурным кантэкстам, кніга можа выклікаць цяжкасці. Тыя, хто можа чытаць па-беларуску, мусяць прачытаць яе ў арыгінале, каб адчуць увесь смак багатай прозы Караткевіча.

Сёння кнігі Ўладзіміра Караткевіча выконваюць надзвычай важную ролю ў жыцці беларусаў – яны ахоўваюць іх калектыўную памяць. Як аўтар гістарычных раманаў, ён быў адначасова даследнікам і дзеячом беларускай гісторыі. Магчыма, у гэтым сэнсе “Дзікае паляванне караля Стаха” Ўладзіміра Караткевіча – гэта кніга пра мінулае і цяперашняе. Гэта даказвае яго літаратурную геніяльнасць і здольнасць тонка вытлумачваць характар беларускай нацыі.